Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1 / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2005. – С. 265

**ВІШАНЬКА** – карагод, танец і гульня.

Карагод "Вішанька" выконваецца парамі па крузе. Уяўляе сабой адначасовае кручэнне дзяўчыны пад рукой хлопца і вакол яго. Хлопец у гэты час простым крокам рухаецца ўслед за дзяўчынай.

Танец "Вішанька" выконваецца парамі, але ў кожным рэгіёне падтрымка ў пары розная: простае злучэнне рук, накрыж перад сабой і інш. Простым крокам выканаўцы рухаюцца па крузе, развярнуўшыся, ідуць назад. Характэрна кручэнне дзяўчыны пад рукой хлопца ў адваротным напрамку і пераход да іншага партнёра.

У гульню " Вішанька"/"Ірваць вішаньку" гулялі пераважна на Каляды. Дзяўчына станавілася на табурэце паміж двух хлопцаў, якія ўзяўшыся за рукі, ахоўваюць яе ад трэцяга, які стаіць побач з імі. Дзяўчына трымае ў роце саломінку і паварочвае галаву з боку ў бок. Той трэці павінен падскочыць да дзяўчыны і губамі схапіць саломінку. Калі гэта ўдаецца, дзяўчына цалуе яго.

*Літ*:. Вількін Я.Р. Беларускія народныя гульні. Мн., 1996;

Лабачэўская К.Л. Беларускія народныя гульні. Мн., 1990;

Гульні, забавы, ігрышчы. Мн., 2000.

*А.В.Дрыгін*